# ПРАЦЯГ ПЕРАГАВОРАЎ У БЕЛЫМ ДОМЕ

ВАШЫНГТОН, 20 чэрвеня. (ТАСС). Учора у Белым доме былі прадоўжаны перагаворы паміж Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжневым і Прэзідэнтам ЗША Р. Ніксанам. Былі разгледжаны пытанні гандлёва-эканамічных адносін паміж СССР і ЗША.

Бакі з задавальненнем канстатавалі значны прагрэс у развіцці гэтых адносін, дасягнуты на працягу мінулага года. Былі разгледжаны шляхі і формы далейшага развіцця гандлёва-эканамічных сувязей паміж абедзвюма краінамі ў шырокіх маштабах на доўгатэрміновай узаемавыгаднай аснове.

У перагаворах прынялі ўдзел з савецкага боку — міністр замежных спраў СССР А. А. Грамыка, міністр замежнага гандлю СССР М. С. Патолічаў, міністр грамадзянскай авіяцыі Б. П. Бугаеў, пасол СССР у ЗША А. Ф. Дабрынін, памочнікі Генеральнага сакратара ЦК КПСС Г. Э. Цуканаў, А. М. Аляксандраў.

З амерыканскага боку — дзяржаўны сакратар У. Роджэрс, міністр фінансаў Дж. Шульц, памочнікі прэзідэнта ЗША Г. Кісінджэр, П. Флэніган, Дж. Канэлі і адказны супрацоўнік Белага дома Х. Хоненфельт.

## У парткоме

На чарговым пасяджэнні парткома падведзены вынікі працы ў сетцы партыйнай асветы. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў член парткома Р. А. Мэлюковіч.

Партыйны камітэт заслухаў сакратара партбюро факультэта журналістыкі М. Е. Дастанку па пытанню здачы норм ГПА на журфаку.

## У мясцкоме

Заканчваецца навучальны год. Наступае перыяд летніх водпускаў, і, натуральна, перад супрацоўнікамі універсітэта ўзнікае пытанне, дзе правесці яго, як лепш арганізаваць гэты час. Мясцовы камітэт універсітэта загадзя правёў вялікую падрыхтоўчую работу з мэтай набыцця пуцёвак на экскурсіі, турысцкія паязды, у дамы адпачынку і. г. д.

На працягу чэрвеня — жніўня трупы турыстаў — супрацоўнікаў універсітэта — пабываюць у паездцы па Закаўказзю. Многія па пуцёўках, атрыманых у мясцкоме, будуць адпачываць у курортных месцах, такіх, як Алушта, Гагры, Новы Афон, Гурзуф.

Больш 70 супрацоўнікаў з сем'ямі правядуць водпуск на возеры Нарач.

У піянерскія лагеры і ў санаторныя піянерскія лагеры паедуць 80 дзяцей супрацоўнікаў універсітэта.

На ліпень — верасень 1973 года мясцовы камітэт атрымае каля 20 санаторных пуцёвак, па якіх супрацоўнікі атрымаюць неабходнае лячэнне; каля 40 супрацоўнікаў правядуць свой водпуск па льготных пуцёўках у дамах адпачынку і на турбазах краіны.

На працягу летняга перыяду мясцовы камітэт будзе арганізоўваць аўтобусныя паездкі па ягады і грыбы.


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (1019) ● ЧАЦВЕР, 21 чэрвеня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII



СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● ПЕРАГАВОРЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА ● У ВЫДАВЕЦТВЕ БДУ ● РАЗВІТВАЮЦЦА ВЫПУСКНІКІ ● СЕСІЯ ● РАСКАЗВАЮЦЬ ЛАЎРЭАТЫ ● ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Ф. В. ГЛАДКОВА ● ТЭАТР ● СПОРТ


# ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ!



Як мы ўжо паведамлялі, нядаўнімі гасцямі нашага універсітэта былі прадстаўнікі Ягелонскага (ПНР) і Сафійскага (НРБ) універсітэтаў. Госці пазнаёміліся з БДУ, са славутасцямі сталіцы Беларусі. Вынікам гэтых візітаў з'явілася падпісанне планаў міжвузаўскага супрацоўніцтва на 1974—1975 гг.

**На здымках:** рэктар Сафійскага універсітэта Х. Хрыстаў, сакратар партыйнай арганізацыі З. Запранаў, прарэктар БДУ па навуковай рабоце Л. В. Валадзько ва універсітэцкай бібліятэцы.

Прадстаўнікі БДУ на чале з рэктарам прафесарам У. М. Сікорскім і дэлегацыя Ягелонскага універсітэта, якую ўзначальвае акадэмік М. Карась, у час падпісання плана супрацоўніцтва.

Фота **Д. Прэса.**




ХУТКА ПАКІНУЦЬ СЦЕНЫ РОДНАГА УНІВЕРСІТЭТА ВЫПУСКНІКІ І ПАНЯСУЦЬ З САБОЙ У ВЯЛІКАЕ САМАСТОЙНАЕ ЖЫЦЦЁ ЎСЁ РАЗУМНАЕ, ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ, ПАЧЭРПНУТАЕ Ў СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ.

ДЫК НЯХАЙ ШЧАСЛІВЫМ БУДЗЕ НОВЫ ПЕРЫЯД ВАШАГА ЖЫЦЦЯ! НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ БДУ!

# МАРА ЗБЫЛАСЯ— МАРА НАРАДЖАЕЦЦА

**Размова нашага карэспандэнта Т. Засім з Ангелінай Цудня, студэнткай V курса беларускага аддзялення філфака.**

— Пяць гадоў таму назад упершыню пераступлен парог аўдыторыі. Якімі ўяўляліся тады гэтыя апошнія дні студэнцкага жыцця?

— Аб іх амаль і не думалася. Вельмі ж вялікай была радасць ад паступлення, новых уражанняў, і вельмі ж маладымі былі мы самі, каб адразу кінуцца ў халодныя разважанні аб далёкіх выніках.

— А як жа цяпер успамінаюцца ўжо, напэўна, паўзабытыя ўступныя экзамены?

— ...Цікава, хвалююча, крыху неверагодна — было ці не?.. І не зусім сур'ёзна і складана ў параўнанні з наступнымі цяжкасцямі...

— Ці хочацца вярнуць гэтыя пяць гадоў назад?

— Хочацца. Хочацца пачаць іх спачатку яшчэ не адзін раз. Студэнцтва і маладосць непадзельныя. А каму ж не хочацца быць вечна маладым? З другога боку, хочацца паспытаць усяго пакрысе, і таму прыцягвае будучая работа... Напэўна, у гэтай разнастайнасці жыцця ўся яго каштоўнасць: ёсць магчымасць параўноўваць розныя перыяды, ацэньваць іх. І нечым даражыць больш за ўсё...

— Дыплом, спецыяльнасць. Напэўна ж, не толькі гэта далі пяць год вучобы?

— Далі новых сяброў, сяброў на ўсё жыццё — гэта самае каштоўнае набыццё. Дапамаглі сур'ёзней глядзець на жыццё, глыбей разумець яго.

— Атрымана многа. І ўсё ж: ці не засталося нешта нявыкарыстаным, ці не прайшло міма?

— Паступаючы на філфак, мы не ведаем акрэслена, кім будзем: той, хто хоча стаць педагогам, ідзе ў педінстытут. Мы таксама атрымліваем спецыяльнасць педагога, але педагагічная практыка, навыкі работы ў школе ў нас меншыя. Па «асабістай» віне мы «недаатрымалі» ў вну няшмала. Прычыны — недахоп волі, часам абыякавасць, безадказнасць у адносінах да сваіх студэнцкіх абавязкаў, няўменне правільна арганізаваць рабочы дзень. Што не атрымалі, давядзецца набываць самастойна ўжо ў час работы...

— Якім жа ўяўляецца першы ўрок першага дня самастойнай работы?

— Якім будзе, цяжка сказаць. Больш пэўна можна гаварыць аб маіх марах адносна яго. Хочацца, каб ён удаўся, стаў добрым пачаткам далейшай работы, здружыў з вучнямі...

— Лета — адказная пара не толькі для дыпломнікаў. Недзе сядзяць над падручнікамі дзесяцікласнікі, рыхтуюцца да ўступных экзаменаў абітурыенты, першакурснікі вось-вось перастануць быць «малымі» і


*(Працяг на 2-й стар.).*


# ШЧАСЛІВАГА ШЛЯХУ!

Пачалося размеркаванне на фізічным і матэматычным факультэтах, на факультэце прыкладной матэматыкі. Больш 300 маладых спецыялістаў паедуць працаваць у розныя куткі краіны, на заводы і фабрыкі, у школы і навукова-даследчыя інстытуты Мінска, Гомеля, Смаргоні і іншых гарадоў і раённых цэнтраў Беларусі.

Шчаслівага вам шляху, сябры!

# Будзе выдадзена ў 1974 годзе

Выйшаў у свет тэматычны план на 1974 год выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. У будучым годзе плануецца выпусціць шэраг актуальных кніг па грамадска-палітычнай, прыродазнаўча-навуковай, філасофскай, гістарычнай тэматыцы. У плане 15 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Сярод іх асобае месца зойме перавыданне падручніка «Курс лекцый па гісторыі КПСС, ч. II», які атрымаў высокую ацэнку ў цэнтральным друку, а таксама выпуск падручніка калектыву аўтараў — вучоных нашага універсітэта «Палітычная эканомія сацыялізму».

Значнае месца ў тэмплане займае літаратура па грамадска-палітычнай тэматыцы, якая налічвае 22 назвы. Тут варта адзначыць кнігі І. І. Сяровай «Сила, сплачивающая воедино» (інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных у развітым сацыялістычным грамадстве), П. П. Селіванчыка і А. П. Мельнікава «Узаемаадносіны і збліжэнне нацыянальных культур у перыяд будаўніцтва камунізму», А. Т. Лейзерава «Савецкая выбарчая сістэма», Е. П. Белязо «Беларуская вёска ў пасляваенныя гады», І. Л. Пятровіча «У. І. Ленін аб задачах рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Польшчы», А. П. Ігнаценкі «Барацьба беларускага народа за ўз'яднанне з Расіяй. Другая палавіна XVII—XVIII стагоддзяў».

У 1974 годзе выдавецтва выпусціць у свет нямала кніг па прыродазнаўча-навуковай тэматыцы. Сярод іх такія, як «Лекцыі па матэматычнаму аналізу. Частка I» Ю. С. Багданава, «Асновы гідралогіі сушы» Б. Б. Багаслоўскага, «Механіка руху» А. С. Прэдвадзіцелева і іншыя. Літаратура па філасофіі будзе прадстаўлена такімі кнігамі, як «Лагічная прырода гіпотэзы» А. П. Хількевіча, «Логіка» калектыву аўтараў, «Прадбачанне і выпадковасць» Г. В. Рубанава і іншыя.

Шэраг цікавых работ плануецца выпусціць па раздзелу «Літаратура па філалогіі, журналістыцы і педагогіцы». Тут варта адзначыць «Традыцыі і сучаснасць» Н. М. Рамашкі, «Многааблічны экран» М. Е. Дастанкі і А. А. Плаўнік, «Аналітычныя жанры» (пытанні тэорыі і практыкі) Б. В. Стральцова, «Дапаможнік па беларускай мове для паступаючых у вну» Я. М. Камароўскага, Е. С. Мяцельскай.

Усе рукапісы тэмплана 1974 года атрыманы выдавецтвам ад аўтараў і рыхтуюцца да здачы ў вытворчасць.

А. ЛЯПІЧ,
рэдактар выдавецтва БДУ
імя У. І. Леніна.

# МАРА ЗБЫЛАСЯ— МАРА НАРАДЖАЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

«прамакашкамі», перадаўшы гэтыя мянушкі ў спадчыну новаму першаму курсу. Што б хацелася пажадаць малодшым сябрам?

— Дзесяцікласнікам, калі яшчэ да гэтага часу не выбралі жыццёвы шлях,— хай не ідуць на філфак. Не знайшоўшы загадзя ў сабе прызвання да літаратуры, мовы — ці змогуць яны па-сапраўднаму аддацца гэтай рабоце? А выпадковыя людзі, як і ўсюды, там не патрэбны. Абітурыентам, што паступаюць сёлета на наш факультэт, — поспехаў, добрага настрою і гатоўнасці да любых цяжкасцей, якія абавязкова будуць. А першакурснікам — дружбы, паэзіі, аптымізму на наступныя гады вучобы і далей — на ўсё жыццё.

— Апошняе выпрабаванне — абарона дыпломнай работы. Цэлы год — усе думкі аб ёй. Ці з'явілася яна своеасаблівым адкрыццём хаця б для сябе самой?

— Для сябе я адкрыла: колькі яшчэ трэба працаваць, каб па-сапраўднаму адкрыць нешта! Увогуле, дыпломная — заўсёды адкрыццё. Адкрыццё ведаў чалавека, яго здольнасцей, светапогляду. Напэўна, не адкрыла новага ў літаратуразнаўстве мая дыпломная. Але ў мяне была мэта: выкласці свае думкі, назіранні, заключэнні аб неўміручым купалаўскім «Кургане»...

— Была мара паступіць, атрымаць дыплом. Аб чым цяпер марыш?

— Хочацца, каб са студэнцкім жыццём не закончылася ўсё добрае, светлае, цікавае. Хачу, каб праца была і для мяне радаснай, і людзям карыснай. А яшчэ: сустрэцца б нам праз некалькі год...

— А, сустрэўшыся, абавязкова ўспомніце нейкія яркія старонкі студэнцкага жыцця. Напэўна ж, ёсць такія?

— Іх пералічыць немагчыма. Па-першае, гэта ўсё тое, што аднойчы адбылося ўпершыню: першая лекцыя, першы экзамен, першая практыка, «бульба», будаўнічы атрад. Цяжкасці і няўдачы першыя. Нашаму выпуску будзе што ўспомніць: 50-годдзе Савецкай улады, 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, юбілей універсітэта, рэспублікі, 50-годдзе ўтварэння СССР. Не кожнаму пашанцуе сустракаць стольсі свят у сценах вну. Ну і, вядома ж, запомнім апошні званок — кульмінацыйны момант усіх пяці год...

# САМЫ НАПРУЖАНЫ ЧАС

Сесія — гарачая пара не толькі для студэнтаў. Гэта час самай напружанай работы кабінетаў і лабараторый. На геафаку прыход сесіі найбольш адчувальны для кабінетаў геалогіі, геадэзіі і глебазнаўства.

— Гэта звязана з тым,— гаворыць старшая лабарантка кафедры геалогіі Т. Ф. Рослік, — што на практычных занятках, якія праводзяцца ў гэтых кабінетах, выкарыстоўваюцца не толькі літаратура, вучэбныя дапаможнікі, але і разнастайныя прыборы, калекцыі і карты. Цяпер, у час сесіі, кабінеты працуюць нават у выхадныя дні. У кабінеце геалогіі ідуць практычныя заняткі студэнтаў-завочнікаў. Да іх паслуг — калекцыі мінералаў і горных парод, дапаможныя табліцы. Частыя наведвальнікі кабінета — дыпломнікі. У вызначаныя дні яны могуць сустрэцца тут з выкладчыкамі, кіраўнікамі дыпломных работ, атрымаць патрэбную кансультацыю.

Падрыхтоўка да летняй практыкі — яшчэ адзін бок работы кабінета. Для першакурснікаў напярэдадні іх ад'езду на практыку ў Валожынскі раён была падрыхтавана выстаўка, якая адлюстроўвае праходжанне практыкі І курсам у мінулым годзе. Тут можна пазнаёміцца з палявымі дзённікамі, запіснымі кніжкамі, прывезенымі з практыкі мінулым летам.

Лабараторыя практычных заняткаў па глебазнаўству. Тут толькі на першы погляд ціха і спакойна. Практычных заняткаў сёння ў завочнікаў няма, але да іх усё ўжо падрыхтавана: прыборы, карты. Практычныя заняткі ў лабараторыі надзвычай цікавыя і адказныя. Студэнты вызначаюць гідралітычную кіслотнасць глебы, PH, рухомы калій і фосфар у глебе.

Сёння ў лабараторыі збор студэнтаў ІІІ—IV курсаў, якія ад'язджаюць на практыку. Іх пазнаёмяць тут з праграмай практыкі, трэцякурснікі змогуць атрымаць кансультацыю адносна тэм курсавых, а чацвёртакурснікі — дыпломных работ. А пакуль раз-пораз адчыняюцца дзверы — заходзяць пяцікурснікі, прыносяць дыпломныя работы, кансультуюцца, капіруюць карты...

Найбольш работы ў гэты час, бадай, у кабінеце геадэзіі. Тут тыя ж самыя практычныя ў завочнікаў, тыя ж дыпломнікі і тыя ж сходы перад ад'ездам на практыку студэнтаў, замацаваных за кафедрай геадэзіі і картаграфіі. Але да гэтага ад'езду трэба падрыхтаваць усе прыборы і інструменты, выдзеліць іх на кожную групу, праінструктаваць студэнтаў. У кабінеце ў дапамогу ад'язджаючым на практыку арганізаваны стэнд «Палявая практыка студэнтаў», фотавітрына, якія расказваюць аб мінулай практыцы. Яны цікава знаёмяць студэнтаў з іх працай і абавязкамі ў час практыкі.

**Т. КОСЦІНА.**

# ШТО НОВАГА НА МАТФАКУ?

Ідзе сесія. І яе подых адчуваеш усюды.

— У гэтым семестры ў параўнанні з мінулым, — расказвае А. С. Мізрахі, старшы лабарант кафедры агульнай матэматыкі, — больш добрых і выдатных адзнак. Напрыклад, дзесятая група ІІ курса ў мінулым семестры мела восем здавальняючых і дзве дрэнныя адзнакі па дыферэнцыяльных ураўненнях, у гэтым — толькі шэсць пасрэдных адзнак. У восьмай групе было 12 «здавальняюча», зараз — сем.

Больш за ўсё нас цікавяць, вядома, першакурснікі. Як у іх справы? Ці паспелі яны, як кажуць, «акліматызавацца» ва універсітэце? Ці ёсць зрухі ў параўнанні з мінулай сесіяй?

Першакурснікі здалі ўжо залікі па гісторыі КПСС і замежнай мове. Здалі ў асноўным добра, калі не лічыць, што ў першай — трэцяй групах па некалькі незалікаў, ёсць яны і ў іншых групах.

Аналітычная геаметрыя і лінейная алгебра лічацца самым цяжкім прадметам. Тым не менш 11 выдатных адзнак атрымана ў чацвёртай групе, 13 — у пятай. Экзамен ёсць экзамен. Бываюць і нечаканасці. Так, напрыклад, Наташа Нікуленак у першым семестры атрымала па аналітычнай геаметрыі «выдатна», а ў гэтым — толькі «здавальняюча», дзесяць пасрэдных адзнак у другой групе. Шостая група няздрэнна здала экзамен па матэматычнаму аналізу. Наперадзе — вышэйшая алгебра.

Другі курс здаў тры залікі і два экзамены: па матэматычнаму аналізу і фізіцы. Сем «выдатна» ў першай групе, 12 — у шостай.

На чацвёртым курсе пасрэдныя адзнакі — з'ява даволі рэдкая. Усе студэнты трэцяй групы, акрамя двух, атрымалі выдатныя адзнакі па курсавой рабоце.

Зусім блізка дзень апошняга экзамена. Спадзяёмся, што будзе ён для матэматыкаў прыемным.

**Л. ДРУЗЕВА.**

# ДРУГОЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Для нас, першакурснікаў, неяк вельмі хутка праляцеў гэты навучальны год. Засталіся толькі ў памяці і залікоўках нашы першыя выпрабаванні. Сёння мы жывем другой у сваім студэнцтве сесіяй. Здадзены ўсе залікі. З адказнасцю рыхтаваліся мы да іх. Шмат цікавага далі нам лекцыі і практычныя заняткі па сучаснай беларускай і рускай мовах, семінарскія па гісторыі КПСС і іншыя.

Зараз усе філолагі-першакурснікі напярэдадні самага адказнага выпрабавання — экзамена па стараславянскай мове. І хоць старшакурснікі махаюць рукой на нашу сесію, маўляў, адзін экзамен—нічога ў параўнанні з пяццю —мы адчуваем, наколькі сур'ёзнае гэта будзе выпрабаванне.

Першай «прымае агонь на сябе» мая ІІ група. У інтэрнаце — ажыўленыя, заклапочаныя твары. Мы хвалюемся, бо ведаем, што з намі будзе гутарыць выдатны вучоны, прафесар Адам Яўгеньевіч Супрун. І вельмі хочацца, каб «першы блін» быў не комам, каб выдатным было наша жніво.

**Т. КУПРЭВІЧ.**





*Экзамен па гісторыі СССР здае студэнтка ІІ курса гістфака Оля ЯРОМІНА. Прымае дацэнт В. А. ЦІТОК.*

*Фота Д. Чаховіча.*

# МЫ - ЛАЎРЭАТЫ

Лаўрэат... Гэта слова набыло для мяне адценне ўрачыстасці, афіцыйнасці і важнасці. І, як мне адразу здалося, зусім не адпавядала маёй сціплай асобе. Менавіта таму нешта падобнае на страх і хваляванне авалодала мной у аэрапорце, дзе я далучылася да групы маладых сваіх спадарожнікаў — таксама ўдзельнікаў IV канферэнцыі лаўрэатаў рэспубліканскага агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых работ вну БССР. Вясёлыя, радасныя, мы прыкавалі ўвагу пасажыраў, а адзін з іх, пажылы, нават спытаў:

— Студэнты?

— Так. Лаўрэаты,— усміхнулася я.

— А... Вось яно як...— з павагай агледзеў нас мой субяседнік.

Вось з якім настроем прыляцелі мы ў Гомель. Тут нас ужо чакалі новыя сябры: студэнты Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту (БІІЧТ) — гаспадары канферэнцыі.

Віктар Навумчык, студэнт V курса фізфака, адчуваў сябе тут не навічком: часта сустракаў старых знаёмых па іншых канферэнцыях. У фае інстытута сабралася многа студэнтаў з Гродна, Магілёва, Мінска, Віцебска, Брэста. Усіх іх аб'ядноўвала адно — сапраўднае імкненне да ведаў, пошук невядомага. І было вельмі прыемна пастаяць і проста пагутарыць са сваімі аднадумцамі.

Прынялі нас вельмі добра і ўважліва. Пасля адкрыцця канферэнцыі мы ўсе разам сабраліся на вечары сустрэчы са студэнтамі БІІЧТа і Гомельскага універсітэта. Гаспадары паказалі нам цікавы канцэрт, расказалі аб сваіх навучальных установах, аб горадзе.

Экскурсія па Гомелю прынесла ўсім нам вялікую радасць, асабліва тым, хто быў тут упершыню. Але, вядома, асноўнымі і самымі цікавымі былі пасяджэнні секцый. Кожны з нас хваляваўся: як пройдзе яго даклад, ці зможа ён зацікавіць іншых, ці будуць пытанні і якія?

Работа секцый праходзіла па-дзелавому, удзельнікі задавалі цікавыя пытанні, а часам уносілі і прапановы. Бадай, аднымі з самых шматлікіх і ажыўленых былі пасяджэнні секцыі філалагічных і мастацтвазнаўчых навук. Сюды нават заглядвалі студэнты з іншых секцый. Заслужаную пахвалы тут даклад студэнта IV курса філалагічнага факультэта В. Лайкова «Рыгор Барадулін —«Неруш». Вялікая дыскусія разгарнулася па тэме «Тэатральная рэцэнзія як жанр». Работы нашых студэнтаў вызначаліся актуальнасцю і глыбінёй раскрыцця тэмы.

На пленарным пасяджэнні СНТ БССР у Гомельскім ДК чыгуначнікаў імя У. І. Леніна было сказана многа цёплых слоў у адрас студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта. У ліку лепшых і арыгінальных работ назван даклад В. Навумчыка «Вымярэнне працягласці узбуджанага стану малекул фазавым спосабам» (ІІ прэмія).

І, калі адкрыта прызнацца, кожны з нас ганарыўся, бо і яго заслуга у тым, што кіраўнік нашай дэлегацыі Д. М. Саковіч восъ цяпер на сцэне атрымлівае грамату Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР за высокія паказчыкі ў рэспубліканскім аглядзе.

Канешне, не ўсе студэнты, якія ўдзельнічаюць у СНТ, станучь вучонымі, даследчыкамі. Але галоўнае ў тым, што калі чалавек нешта шукае, хоча аб нечым даведацца, ён загараецца маленькім агеньчыкам прагі да ведаў. Чым больш мы шукаем, тым больш зможам аддаць людзям. І не так важна, дзе гэта будзе: у школьным класе або ў студэнцкай аўдыторыі, у навуковай лабараторыі або ў заводскім цэху.

Прага да ведаў можа наталіцца толькі новымі ведамі. А для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці: чытальныя залы, бібліятэкі, вопытныя кіраўнікі.

Многія з цяперашніх лаўрэатаў пачалі сваю работу ў СНТ яшчэ з першых курсаў.

— Спачатку многае было незразумелым, і работа зводзілася да простых вопытаў. Але праз некаторы час, з першымі ўдачамі і знаходкамі, з'явілася цяга да больш дасканалых і глыбокіх даследаванняў, — гаворыць студэнтка V курса хімічнага факультэта Л. Скоблікава. — Лепш пачынаць адразу ж, на малодшых курсах. Дзякуючы гэтаму можна паспець больш зрабіць. І сама вучоба становіцца не проста «вучэбным працэсам», а сродкам да мэтанакіраваных даследаванняў.

Так, не варта цягнуць усіх і кожнага ў рады СНТ, не трэба ўгаворваць гультаёў: «Ну, паспрабуй, табе гэта спадабаецца». Лепшымі агітатарамі будуць наша работа, нашы перамогі і знаходкі. А найлепшым сродкам прапаганды іх з'яўляюцца факультэцкія, агульнауніверсітэцкія і рэспубліканскія канферэнцыі.

Хутка студэнцкія рады папоўняць першакурснікі. І наша задача — дапамагчы ім знайсці сябе ў нялёгкай працы. Дй і тым, каму яшчэ застаецца час вучыцца, зусім не позна ўзяцца за навуковую работу. Вынікі не прымусяць сябе чакаць. Шукайце, і вы знойдзеце! Удачы вам, дарагія лаўрэаты будучых конкурсаў!

**Т. ЯГОРАВА,**
**студэнтка журфака.**

# БЕРАГЧЫ НАРОДНЫ СКАРБ

Нядаўна выйшла з друку кніга «Песні сямі вёсак»*. Гэта шматгадовая праца студэнтаў філалагічнага факультэта і выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры.

У 1960 годзе быў створан фальклорны гурток, якім кіруе дацэнт Н. С. Гілевіч. Асноўная яго задача была ў той час—сабраць багаты народны скарб. І вось першакурснікі і выпускнікі па крупіцах папаўняюць фальклорную скарбонку. Кожны год арганізоўваліся навуковыя экспедыцыі. Фальклорная практыка студэнтаў мела важнае значэнне для ўзбагачэння ведаў па збору матэрыялаў. Прадстаўленыя матэрыялы абмяркоўваліся на пасяджэннях гуртка, звяраліся з надрукаванымі раней тэкстамі. А потым многія гурткоўцы распрацоўвалі цікавыя даклады па паэтыцы і эстэтыцы фальклору. Найбольш цікавыя з іх былі прадстаўлены на агляды студэнцкіх навуковых работ, атрымалі высокія ацэнкі.

І вось нарэшце было задумана выдаць некалькі кніг па накопленаму багатаму матэрыялу. «Песні сямі вёсак» — першая з трохтомнага выдання. Зборнік традыцыйнай песеннай творчасці беларускага народа своеасаблівы па задуме і кампазіцыі. Ён складаецца з народных песень, запісаных у сямі вёсках Мінскай вобласці: Альсевічы — Мядзельскага, Арэшніца — Клецкага, Дзмітравічы — Бярэзінскага, Лебедзева — Маладзечанскага, Налібокі — Стаўбцоўскага, Паляны — Барысаўскага і Слабада — Лагойскага раёнаў.

Гэта кніга сведчыць аб дзівосным паэтычным і музычным скарбе, які беражліва захоўвае народ. Тут сабраны варыянты песень, самыя багатыя і змястоўныя, цікавыя і арыгінальныя ў мастацкіх адносінах. І таму зборнік можа быць выкарыстан студэнтамі філалагічных факультэтаў як вучэбны дапаможнік па курсу вуснай народнай творчасці.

У падрыхтоўцы гэтага выдання самы актыўны ўдзел прымалі студэнты-гурткоўцы В. Занько, Л. Тарасюк, Н. Васілевіч, Т. Шабан і многія іншыя.

Зараз гуртоўцы на чале са сваім кіраўніком Н. С. Гілевічам падрыхтавалі да выдання другі том фальклорных запісаў. Тут будуць прадстаўлены матэрыялы абрадавай паэзіі, запісаныя ў розных кутках Беларусі.

Не менш цікавым будзе і трэці том, які зараз рыхтуецца да выдання. Ён змесціць песні сацыяльна-бытавыя і частушкі. Трэба адзначыць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтых тамоў студэнтаў-першакурснікаў Л. Яновіч, І. Янушэўскай, В. Скапец, В. Хіхіча, Д. Трасько, В. Палачанінай, Н. Дубік, З. Кулеш і многіх іншых.

**В. КЛАДЗІНСКІ.**

* **Песні сямі вёсак.** Традыцыйная народная лірыка Міншчыны. Пад рэдакцыяй Н. С. Гілевіча. Выд. «Вышэйшая школа», Мінск, 1973 г.

---

*Да 90-годдзя з дня нараджэння Ф. В. Гладкова*

# ДРУГ І НАСТАЎНІК МОЛАДЗІ

«Дарагі друг, — звяртаецца Ф. В. Гладкоў да Людміла Стаянава, — чалавек павінен апраўдаць сябе сваім жыццём: яго каштоўнасць вызначаецца яго дзеяннямі — ён абавязан тварыць новае, непаўторнае. І Вы бліскуча апраўдалі высокае званне чалавека». Гэтыя словы поўнасцю можна аднесці да самога Ф. В. Гладкова, усё жыццё і дзейнасць якога былі аддадзены рэвалюцыі і народу, барацьбе за перамогу ідэй сацыялізму.

У літаратуру Ф. В. Гладкоў уступае на рубяжы двух вякоў і больш паўстагоддзя служыць ёй самаааддана. Нельга не адзначыць той вялікай ролі, якую адыграў А. М. Горкі ў станаўленні мастацкага майстэрства пісьменніка.

У маладой савецкай літаратуры 20-х гадоў Ф. Гладкоў выступае як мастак-наватар. Яго «Цэмент», увасобіўшы горкаўскую тэму працы, адкрывае новую паласу ў літаратурным працэсе тых год.

Палымяныя характары бальшавікоў-ленінцаў, стваральнікаў новага жыцця, выведзеныя ў рамане, працягваюць і сёння хваляваць чытачоў. Рэжысёр Манфрэд Векверт, які закончыў у цяперашні час у ГДР здымкі тэлевізійнага фільма «Цэмент», адзначае на старонках газеты «Нойес Дойчланд»: «Гладкоў не згаджаўся з даволі частай яшчэ характарыстыкай яго кнігі як толькі «індустрыяльнага рамана». Ён гаварыў, што «Цэмент» ніяк не падыходзіць пад гэтае азначэнне, пакольні галоўная ўвага ў ім удзелена людзям і іх паводзінам, і, акрамя таго, ён узнімае важнейшае для кожнага рэвалюцыйнага перыяду пытанне аб сэнсе жыцця... Гэтую аповесць аб далёкіх гераічных днях мы хочам перадаць сённяшняй моладзі як эстафету...». Як адзначала «Литературная газета» 1 мая 1973 года, прэм'ера фільма будзе, відаць, прыўрочана да X Сусветнага фестывалю моладзі ў Берліне.

Паяўленню «Цэменту» папярэднічаў дваццаціпяцігадовы перыяд літаратурнай дзейнасці пісьменніка. Аб ім ён успамінае: «З першых жа крокаў маёй літаратурнай творчасці, г. зн. яшчэ ў раннім юнацтве, няхай яшчэ паўсвядома, мяне перш за ўсё хвалююць вобразы рэвалюцыйнай барацьбы: мяцежныя фігуры рабочых і беспрацоўных («Пасля работы», «Максютка») і рэвалюцыйнай інтэлігенцыі («Свежая магіла», «З палітычных»). Актыўны ўдзел у партыйнай рабоце ўжо акрэслена вызначае маю тэматыку: гэта — ужо праблемы рэвалюцыі, гэта —ужо свет людзей, жыццё і ідэалы якіх—у няспыннай барацьбе за справу рабочага класа («Арыштанцкі вагон», «Іскры», а пасля—«Ізгоі»)...

Мастак-наватар Ф. В. Гладкоў з'яўляецца адным з пачынальнікаў літаратуры сацыялістычнага рэалізму. «Энергія», «Бярозавы гай», «Маці», «Клятва», «Аповесць аб дзяцінстве», «Вольніца», «Ліхая гадзіна», «Мяцежнае юнацтва», дзесяткі аповесцей, апавяданняў, нарысаў, артыкулаў, п'ес прадстаўляюць мастацкую спадчыну пісьменніка.

Кнігі Ф. Гладкова перакладзены на ўсе мовы свету. У пісьме да Нікалае Марару (9 кастрычніка 1958 г.) ён адзначаў: «Я ведаў... што «Цэмент» у розных краінах народнай дэмакратыі меў (і, здаецца, мае) вялікае рэвалюцыйна-выхаваўчае значэнне. Я атрымліваў многа пісем з Балгарыі, Венгрыі, Германіі, Францыі, Кітая ад рэвалюцыянераў і радавых чытачоў з першых жа год паяўлення гэтай кнігі ў перакладах, і пісьмы гэтыя я атрымліваю да гэтай пары. Было многа гарачых, усхваляваных пісем, якія вельмі радавалі мяне, і я адчуваў свой удзел у рэвалюцыйнай барацьбе народаў гэтых краін. Было і горка, што людзі пазбаўляліся свабоды і мучыліся з-за «Цэменту», а ў Кітаі за яго нават секлі галовы. Але ж у жорсткіх класавых бітвах ахвяры непазбежны».

Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва СССР захоўвае вялікую колькасць пісем маладых карэспандэнтаў нашай краіны і многіх краін свету Ф. В. Гладкову. У іх — самыя розныя пытанні, выказванні падзякі і захаплення, выкліка765ныя чытаннем яго кніг. Студэнтка з Лейпцыга Крысціна Пухта цікавіцца творчай гісторыяй рамана «Цэмент», а вучань 11-гадовай сярэдняй школы г. Полна (Чэхаславакія) дзеліцца сваімі ўражаннямі: «Для нас, чэшскіх чытачоў, «Энергія» мае вялікае значэнне, таму што вырашае многія, у нас актуальныя, пытанні, паказвае нам шлях, па якому прабівалася рэвалюцыя да новых форм жыцця, паказвае гераізм і самаадданасць савецкага народа, які нам дапамог і дапамагае на нашым шляху да сацыялізму».

Пісьмы гэтыя сведчаць перш за ўсё аб тым, што моладзь знаходзіць у кнігах Ф. В. Гладкова адказы на хвалюючыя яе пытанні, што творы пісьменніка дапамагаюць ёй вызначыць сваё месца ў барацьбе за новае жыццё.

Шырокая, я б яе назваў, мастацка-педагагічная, выхаваўчая дзейнасць праслаўленага пісьменніка. Больш пятнаццаці год аддаў ён настаўніцкай працы ў школах Забайкалля і Кубані і на ўсё жыццё захаваў у сабе цягу да гэтай цяжкай і пачэснай дзейнасці, заўсёды застаючыся выхаваццелем падрастаючага пакалення. Усё жыццё ён не парывае сувязей з моладдзю: на Кубані ў гады грамадзянскай вайны ён працуе ў органах народнай адукацыі, у Маскве арганізуе і ўзначальвае першы рабфак паліграфістаў, а пасля Вялікай Айчыннай вайны ўзначальвае Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага.

Многа душэўнай цеплыні аддае ён студэнцкай моладзі, выхаванню студэнцкай змены. У накідах аўтабіяграфіі ён з гордасцю падкрэсліваў, што «за работу сярод моладзі атрымаў Ганаровую грамату ЦК ВЛКСМ».

Ф. В. Гладкоў часта звяртаецца са старонак «Пионерской правды» да юных ленінцаў. Ён расказвае ім пра вялікага пісьменніка зямлі рускай М. В. Гогаля, заклікае памнажаць і ахоўваць дабро нашага народа — лесапасадкі. Настаўнік-энтузіяст Мартын Мартынавіч у аповесці «Бярозавы гай» заклікае рабят упрыгожваць зямлю не толькі кветкамі, але садамі і гаямі.

У артыкуле «Пра крыху размашыстага хлопца» ён піша аб становішчы ў школьнай справе, у «Слове да маладых» — аб культуры і маральным вобліку савецкага спартсмена. На старонках «Комсомольской правды» можна прачытаць яго палымяныя словы, звернутыя да моладзі ў сувязі з 40-годдзем ВЛКСМ, а за некалькі дзён да смерці ён віншуе маладых літаратараў з 25-годдзем Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага.

Ф. В. Гладкоў шырока адлюстроўвае работу настаўнікаў, настойліва сцвярджаючы, што «настаўніцтва — гэта шлях да пазнання і прыгажосці, гэта выпрацоўка асабістых паводзін...».

Некалькі слоў хочацца сказаць пра Фёдара Васільевіча як чалавека. Заўсёды строгі і патрабавальны да сябе, ён заставаўся прынцыповым, але чулым і спагадлівым сябрам да іншых. У канцы 40-х гадоў я асабіста пераканаўся ў душэўнай цеплыні, сардэчнасці, уважлівасці Фёдара Васільевіча. У 1949 г. у часопісе «Новый мир» з'явілася «Аповесць аб дзяцінстве» Ф. В. Гладкова. Тэматыка, паэтыка, стыль гэтай чаруючай музыкай слова аўтарскай споведзі не маглі не ўразіць нават недасведчанага чытача, знаёмага з іншымі кнігамі яе аўтара. Здавалася, што гэта памылка, што стваральнікам гэтага эпічнага палатна ў стылі традыцыйнай рускай аўтабіяграфічнай класікі не можа быць Ф. Гладкоў — аўтар ударных, публіцыстычна завостраных, злабадзённых і палітычна вострых раманаў «Цэмент» і «Энергія». Параўноўваючы тэксты часопіснай і кніжнай рэдакцый аповесці, я сутыкнуўся з цэлым радам неадпаведнасцей, выклікаўшых здзіўленне не толькі ў мяне, але і ў майго навуковага кіраўніка. Па яго парадзе я і звярнуўся да Фёдара Васільевіча з шэрагам пытанняў. Ён адказаў на іх у грунтоўным, на васьмі старонках пісьме, пасля чаго ў нас устанавілася не толькі перапіска, але ўзнікла і асабістае знаёмства, якое вось ужо больш 20 год я падтрымліваю з сям'ёй Ф. В. Гладкова...

У апошнія гады жыцця, знемагаючы ад цяжкай хваробы, Фёдар Васільевіч знаходзіў час і сілы не толькі для творчай работы, але і для гутарак са сваімі чытачамі. Захопленасць у спрэчках, здавалася, памнажала сілы хворага чалавека, але нястомнага барацьбіта за новае, сацыялістычнае мастацтва. Словы яго іскрыліся, у кожнае з іх ён укладваў часцінку свайго сэрца... Сівавалосы, з вострым, напоўненым мудрай сілай поглядам жывых вачэй, гэты пажылы чалавек напамінаў юнака, які адстойваў у палеміцы свае ідэі. Такім і застаўся Фёдар Васільевіч у маёй памяці назаўсёды.

**Г. СІНЕНКА,**
**кандыдат філалагічных навук, в. а. дацэнта.**

---

# У АБ'ЕКТЫВЕ— ВЫЛІЧАЛЬНЫ ЦЭНТР

● Прафілактыку электронна - вылічальнай машыны «Мінск-32» праводзяць (злева направа) кіраўнік групы механікаў В. Г. Арленка, Л. В. Варанкевіч і начальнік машыны А. В. Рудакоўскі.

● Лічбавы эксперымент з дапамогай ЭВМ «Мінск-32» праводзіцца ў аддзеле падрыхтоўкі і праграміравання задач.

● У аддзеле падрыхтоўкі даных. Парады супрацоўніцы Т. В. Малашанка дае загадчык аддзела Я. Ф. Кавалевіч.

● Абмеркаванне індывідуальных планаў работы ў аддзеле матэматычнага забеспячэння ЭВМ (у цэнтры загадчык аддзела В. А. Адамовіч).

Фота Д. Прэса.









# НАПЕРАДЗЕ— ГАРАЧАЕ ЛЕТА

Нядаўна ў адрас камітэта камсамола біяфака прыйшло пісьмо дырэктара Бярэзінскай сярэдняй школы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці У. З. Гаўрусёва. Вось што ён піша:

«Паважаныя студэнты. Мы, настаўнікі і вучні, зімой гэтага года пазнаёміліся са студэнтамі вашага факультэта, калі яны праходзілі праз наша сяло ў час турысцкага паходу. Асабліва мы ўдзячны за падарунак: гербарый, сабраны студэнтамі ў Беларусі, і альбом аб універсітэце. Гербарый будзе каштоўным наглядным матэрыялам на ўроках батанікі.

Ад імя ўсіх нашых вучняў і настаўнікаў-біёлагаў выказваю вам падзяку за падарунак і жадаю выдатных поспехаў у вучобе, грамадскай рабоце і асабістым жыцці. Чакаем новых сустрэч з вамі, таварышы студэнты».

Такія пісьмы атрымліваць вельмі прыемна. На біяфаку даўно ўжо стала добрай традыцыяй рабіць турысцкія паходы, паездкі па цікавых гістарычных месцах. І гэта не дзіўна, бо інакш не можа жыць біёлаг. Такі ўжо ён чалавек, яго лёгка выдзеліць сярод акружаючых: ён пастаянна ў пошуках новага.

Кожны год студэнты праводзяць лета на вытворчай або вучэбнай практыцы ў кантакце з прыродай. Гэта вельмі цікавая пара, калі пазнаеш многа новага і адкрываеш вочы на акружаючы цябе свет. Кожны са студэнтаў з захапленнем успамінае возера Нарач, дзе мы ўпершыню ўзялі рамку, капалку, марылку, сачок. Тут мы праходзілі кіламетры ў пошуках купальніку горнага або з незвычайнай хуткасцю бегалі за траурніцай. Можа, тады і з'явілася жаданне ўбачыць яшчэ і яшчэ раз прыгажосць роднай прыроды. А можа, шэлест цудоўных дуброў Налібоцкай пушчы падказваў нам, што многа яшчэ ў Беларусі мала вывучаных, некранутых куткоў? А можа, проста таму, што біёлаг — непаседа і вечны падарожнік.

У час канікул і ў выхадныя дні, у любы вольны час адпраўляюцца няўрымслівыя людзі ў паходы. Многа цікавых падарожжаў зрабіла група студэнтаў на чале з выкладчыкам кафедры сістэматыкі раслін А. Т. Федаруком. Нашы турысты прайшлі па гістарычных месцах Беларусі. Яны пабывалі на радзіме Янкі Купалы, Якуба Коласа, Фелікса Дзяржынскага. Студэнты III—IV курсаў зрабілі паход на возера Свіцязь, Блакітныя азёры, у час якога быў сабран гербарны матэрыял для кафедры. Дацэнт гэтай жа кафедры Ю. А. Бібікаў вясной арганізаваў некалькі цікавых паездак у Налібоцкую пушчу з мэтай азнаямлення студэнтаў у вясенняй флорай. А зімой гэтага года студэнты IV курса зрабілі экскурсію па Чарнаморскаму ўзбярэжжу Каўказа па маршруту Адлер — Хоста — Сочы — Гагры — Батумі— Сухумі, у час якой пазнаёміліся з субтрапічнай расліннасцю, пабывалі ў адным з лепшых у свеце Батумскім батанічным садзе.

Цяпер у студэнтаў нашага факультэта экзаменацыйная сесія. А наперадзе — летняя практыка. У гэтым годзе ўпершыню на нашым факультэце ўводзіцца грамадска-палітычная практыка. Студэнты-біёлагі прачытаюць лекцыі перад насельніцтвам аб найбольш цікавых і хвалюючых праблемах біялогіі. Яны дапамогуць на месцах, дзе будуць праходзіць сваю практыку, арганізаваць выпуск насценгазет і «Камсамольскага пражэктара», азнаёмяцца з вопытам работы камсамольскіх арганізацый. Пажадаем жа ім удачы і гарачага лета!

**Е. КУШНЕР,**
**студэнтка V курса,**
**кафедра сістэматыкі раслін.**

## СТУДЭНЦКІ АДПАЧЫНАК

З 2 ліпеня пачынае працаваць інтэрнацыянальны спартыўна-аздараўленчы лагер БДУ. Зацверджан план яго работы на ўсё лета. Студэнтаў чакае цікавая і разнастайная праграма адпачынку. Яна ўключае экскурсіі па Беларусі і Прыбалтыцы, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, ветэранамі партыі, з працоўнымі Мядзельскага раёна, вечары і лагерныя святы, дыспуты і конкурсы.

У плане прадугледжаны цыкл лекцый на міжнародныя тэмы, лекцыі аб народнай гаспадарцы і культуры БССР, аб геаграфіі і прыродзе Нарачанскага краю. Многа ўвагі ўдзелена вучэбна-трэніровачнай і спартыўна-масавай рабоце. Студэнты змогуць здаць нормы комплексу ГПА, сістэматычна займацца любімым відам спорту, для іх арганізуюцца турпаходы па Нарачанскаму краю. Адпачынак у лагеры будзе цікавым і змястоўным.

**Наш кар.**

**ТЭАТР**

# БАЛ—ПРАХАДНЫ

Пяты раз у чэрвені ідзе на сцэне Тэатра юнага гледача ў пастаноўцы Харкаўскага дзяржаўнага акадэмічнага рускага драматычнага тэатра імя А. С. Пушкіна п'еса В. Канстанцінава і Б. Рацэра «Прахадны бал». І кожны спектакль сустракае запоўненая да адказу зала, нібы ўпершыню, горача і сардэчна. У чым жа сакрэт такога поспеху?

Камедыя востра сучасная. Хлопец закончыў школу. І бацькі ўсімі праўдамі і няпраўдамі спрабуюць «уладкаваць» яго ў інстытут. Сяргею ж зусім не па душы «нейкі там фінансавы», ён марыць аб іншым занятку. Пакуль толькі марыць... Але калі ў яго жыццё ўрываецца каханне, Поля з яе ўлюбёнасцю ў літаратуру і педагогіку Песталоці, з яе верай у справядлівасць і дабро, ён пачынае актыўна супраціўляцца волі сваіх бацькоў.

Талент і шчырасць акцёраў прымушаюць паверыць у праўдзівасць падзей, якія адбываюцца на сцэне. Многія эпізоды настолькі рэальныя, што адчуваеш, быццам недзе бачыў такое: ці то ў суседзяў на лесвічнай пляцоўцы, ці то ў сябе дома...

Адразу і надоўга палюбілі гледачы бабулю Ганну Кірылаўну ў выкананні заслужанай артысткі УССР Н. Тамаравай. Палюбілі за яе няўрымслівасць, добры гумар, палюбілі так, як сотні юнакоў і дзяўчат любяць сваіх бабуль і дзядуль.

Запомнілася ўсім тоненькая Поля ў выкананні мяккай і лірычнай Л. Еўдакімавай-Турчанка. Яе мілы жэст, якім яна папраўляе акуляры, шчырая разгубленасць перад мяшчанствам і хлуснёй. Нехта падумаў: а як бы ў такіх абставінах паступіў ён, іншаму ж стала, мабыць, зайздросна і нават сорамна: а я не такі...

Выдатны гратэскавы вобраз рэпецітара Раісы Паўлаўны стварыла А. Маскаленка. Яе гераіні дастаецца шмат апладысментаў.

Добра заявіў аб сабе малады пачынаючы акцёр В. Кузьмін. Яго Сяргей — хлопец, якіх тысячы, і ўсё ж — своеасаблівы, прываблівы і мілы.

Усе разам акцёры стварылі выдатны ансамбль, у якім няма месца ніводнай фальшывай ноце. А гэта і дало магчымасць атрымаць п'есе, дарэчы, пастаўленай упершыню ў краіне на сцэне гэтага тэатра, вышэйшы бал, які аказаўся прахадным да сэрца гледачоў.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# ГОД СПАРТЫЎНЫ

Закончылася круглагадавая спартакіяда і падведзены вынікі агляду-конкурсу па фізкультурнай і спартыўна-масавай рабоце факультэтаў БДУ, прысвечаных 50-годдзю ўтварэння СССР. Завяршыўся яшчэ адзін этап на шляху ўсямернага развіцця фізкультуры і спорту ў студэнцкім калектыве.

Першае месца ў спартакіядзе і аглядзе-конкурсе, зрабіўшы своеасаблівы дубль, заняў спартыўны калектыў ФПМ і даказаў гэтым, што фізічнае выхаванне і спорт стаяць тут на высокім узроўні. Многа ўвагі развіццю фізкультуры і спорту, а, значыць, і найбольш гарманічнаму развіццю студэнтаў, удзяляюць дэканат, партбюро, прафбюро і камітэт камсамола. І таму спартыўнае бюро факультэта пад кіраўніцтвам студэнта IV курса С. Пілілчука змагло стварыць моцны, высокаарганізаваны спартыўны калектыў. Вялікая заслуга ў тым, што спорт на факультэце стаіць на высокім узроўні, старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання і спорту В. С. Мурашова.

У саставе зборных каманд ФПМ выступае 9 майстроў спорту, 15 кандыдатаў у майстры і больш 30 першаразраднікаў, а таксама многа спартсменаў масавых разрадаў. Такія спартсмены, як Т. Надзеева, В. Беляеўскі, А. Комаў, Т. Косціна, І. Тарасюк,— удзельнікі рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтваў. На факультэце 113 спартсменаў з'яўляюцца значкістамі ГПА, а ў здачы норм ГПА прынялі ўдзел больш 80 працэнтаў студэнтаў.

Другое месца ў аглядзе-конкурсе заняў хімічны факультэт, трэцяе — журналісты. Другое і трэцяе месцы ў спартакіядзе занялі адпаведна калектывы фізфака і гістфака.

Сёлетні год быў адзначан многімі спартыўнымі падзеямі ў жыцці універсітэта. Прыемна адзначыць рост майстэрства спартсменаў і, як вынік, паспяховае выступленне ў міжвузаўскай спартакіядзе рэспублікі. З упэўненасцю можна сказаць, што ўнутрыуніверсітэцкая спартакіяда і агляд-конкурс былі адной з рашаючых умоў гэтага поспеху.

У час універсітэцкай спартакіяды вёў вялікую мэтанакіраваную работу спартыўны клуб. Арганізаванасць і маляўнічасць спаборніцтваў, провады ветэранаў і віншаванне пераможцаў не толькі прыцягвалі ўвагу студэнтаў і супрацоўнікаў, але і настройвалі спартсменаў на бескампрамісную барацьбу, мелі вялікае выхаваўчае значэнне.

Універсітэт даўно вядомы сваімі спартыўнымі дасягненнямі. І цяпер яго многія каманды, напрыклад, па лёгкай атлетыцы (трэнер М. А. Жаўнерка), баскетболу (Г. М. Грудо), цяжкай атлетыцы (В. Ф. Кавалёў) і іншыя, з'яўляюцца мацнейшымі ў рэспубліцы. У нас многа спартсменаў, якія абараняюць гонар Белсавета «Буравеснік» і рэспублікі. Гэта В. Фралоў, Т. Надзеева, В. Кайгародава, В. Беляеўскі, Т. Косціна, У. Пац, В. Ярута, А. Цярэхіна, Н. Леташкова, Ю. Глыбоўскі і многія іншыя.

Ва універсітэце, які мае каля 10 тысяч студэнтаў і больш 2 тысяч супрацоўнікаў, вельмі мала спартыўных збудаванняў, таму бывалі накладкі ў графіку спаборніцтваў, зрывы ў календары. Хочацца адзначыць вялікую працавітасць многіх трэнераў і выкладчыкаў, якія, не шкадуючы свайго часу, рыхтавалі спартыўныя зоны да спаборніцтваў.

Спортклуб вядзе і вялікую шэфскую работу. Многія спартсмены-школьнікі трэніруюцца пад кіраўніцтвам вопытных трэнераў у секцыях баскетбола, лёгкай атлетыкі, веласпорту, акрабатыкі, гімнастыкі і іншых. Студэнты дапамагаюць школьнікам у арганізацыі вечароў і спартыўных свят.

Падводзячы вынікі работы спартыўнага клуба за перыяд навучальнага года, хочацца пажадаць новых поспехаў, новых дасягненняў на шляху спартыўнага ўдасканалення ўсім спартсменам універсітэта.

**П. ГЕРАСІМОВІЧ,**
**член праўлення спортклуба БДУ.**

*ТАБЛІЦА ВЫНІКАЎ СПАРТАКІЯДЫ І АГЛЯДУ-КОНКУРСУ*

| Факультэты | Ачкі ў спартакіядзе | Месца ў спартакіядзе | Ачкі ў аглядзе-конкурсе | Месца ў аглядзе-конкурсе |
|---|---|---|---|---|
| ФПМ | 2792 | I | 260 | I |
| Хімфак | 1460 | IV | 205 | II |
| Журфак | 873 | IX | 190 | III |
| Біяфак | 1398 | VI | 185 | IV |
| Фізфак | 2743 | II | 180 | V—VI |
| Гістфак | 2287 | III | 180 | V—VI |
| Матфак | 1434 | V | 155 | VII |
| Юрфак | 1336 | VII | 130 | VIII |
| Геафак | 935 | VIII | 115 | IX |
| Філфак | 741 | X | 30 | X |



ЛЯ ВОЗЕРА. Фотаэцюд В. Жука.

*ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ! Сёння мы развітваемся з вамі да новага навучальнага года. Спадзяемся, што лета, напоўненае практыкай, працай у будаўнічых атрадах, цікавым адпачынкам, дасць вам новы зарад бадзёрасці і багацце ўражанняў, адновіць творчыя сілы, каб вы ўжо ў верасні сталі актыўнымі карэспандэнтамі сваёй шматтыражкі. Вядзіце дзённікі, накоплівайце цікавыя фотаздымкі, пішыце вершы і апавяданні.*

*Чакаем вас у рэдакцыі з матэрыяламі.*

*РЭДКАЛЕГІЯ.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 06192 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Заказ 743.